Карповіч, Н. В. Колькасць і склад хрысціянскага духавенства Беларусі паводле перапісу насельніцтва 1897 г. / Н. В. Карповіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 130–132

***Н. В. КАРПОВІЧ***

# КОЛЬКАСЦЬ І СКЛАД ХРЫСЦІЯНСКАГА ДУХАВЕНСТВА БЕЛАРУСІ ПАВОДЛЕ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА 1897 г

Характарыстыка такой саслоўнай групы, як духавенства, дае падставы для больш паглыбленага разумення дэмаграфічнай і сацыяльнай сітуацыі ў Беларусі другой паловы XIX ст., тым больш што XIX ст. стала пераломным у жыцці хрысціянскіх канфесій.

Пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. палітыка царызму прыняла жорсткую накіраванасць на зацвярджэнне ў Беларусі расійскіх дзяржаўных асноў. Не апошняя роля ў ажыццяўленні гэтай палітыкі адводзілася праваслаўнай царкве, пазіцыі якой на працягу другой паловы XIX — пачатку XX ст. значна ўзмацніліся. Гэта знайшло адлюстраванне ў выніках першага перапісу 1897 г., згодна з якім колькасць праваслаўных складала 60 %, католікаў — 22 %, пратэстантаў — 9 % ад агульнай колькасці насельніцтва беларускіх губерняў [1].

Апублікаваныя па губернях дадзеныя перапісу насельніцтва ўлічваюць колькасць духавенства ўсіх хрысціянскіх канфесій (праваслаўнага, рымска-каталіцкага і пратэстанцкага), а таксама членаў іх сямей.



Духавенства — адна з тых груп, для якой характэрна супадзенне сферы занятасці і саслоўнай прыналежнасці. Згодна з першым перапісам насельніцтва, па групах заняткаў на Беларусі было зафіксавана 6978 святароў усіх хрысціянскіх канфесій (без членаў сямей), з іх праваслаўнага веравызнання — 84 % [2].

Статыстычныя дадзеныя перапісу дазваляюць вызначыць па групах заняткаў і роднай мове нацыянальную прыналежнасць духавенства. Хрысціянскае духавенства, якое лічыла сваёй роднай мовай рускую, складала 54,6 %, беларускую — 42,3 %, польскую — 1,7 % [3]. У асяроддзі праваслаўных свяшчэннаслужыцеляў па пяці беларускіх губернях рускую мову прызнавалі роднай 53,8 %, а беларускую — 42,6 %. Большасць праваслаўных рускіх святароў выконваюць службу ў Мінскай губерні — 24 % [4], найменшая іх колькасць была ў Віленскай губерні — 16 % [5].

З пункту гледжання моўнага крытэрыю Магілёўскую губерню можна назваць беларускамоўнай, бо колькасць духавенства, якое лічыла беларускую мову роднай, складала тут большасць — 45,4 % [6]. Заслугоўвае ўвагі той факт, што гэта адзіная губерня, дзе колькасць святароў, якія прызнаюць роднай мовай беларускую, пераважала над тымі, для каго роднай з’яўляецца руская, амаль у два разы. Самы нізкі паказчык сярод праваслаўнага духавенства, якое прызнае сваёй роднай мовай беларускую, падлічаны ў заходніх беларускіх губернях: у Гродзенскай — 8,1 % [7], у Віленскай — 4,4 % [8].

У свяшчэннаслужыцеляў іншых хрысціянскіх канфесій значная колькасць лічыла роднай мовай польскую — 47,5 %, найбольшая частка польскамоўных святароў была ў Віленскай губерні — 29,3 %. Сярод праваслаўнага духавенства ў гэтай губерні тых, для каго роднай была польская мова, наогул не было, хаця ў астатніх беларускіх губернях у нязначнай колькасці праваслаўнае святарства прызнавала польскую мову сваёй роднай. На другім месцы па колькасці сярод неправаслаўнага хрысціянскага духавенства тыя, для каго роднай была беларуская мова, — 12 %; больш за ўсё іх пражывала ў Віленскай губерні — 4,6 % [9]. Таксама сярод асоб духоўнага звання (неправаслаўнага веравызнання) былі тыя, для каго родная мова нямецкая — 1,5 %.

Згодна з дадзенымі першага перапісу насельніцтва, высокім быў адукацыйны ўзровень хрысціянскага духавенства. Удзельная вага адукаваных сярод хрысціянскіх свяшчэннаслужыцеляў складала 81 %. Большасць духавенства набывалі адукацыю ў сярэдніх навучальных установах. Значная колькасць тых, хто атрымаў сярэднюю адукацыю (ва ўзросце ад 20 да 60 гадоў), выконвалі службу ў Мінскай губерні — 18,8 % [10], найменшая ў Віленскай — 7 % [11]. На другім месцы па колькасці былі асобы, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, прычым больш за ўсё іх было сярод маладога пакалення свята-



роў (ад 30 да 39 гадоў) і складала 36,6 %, прычым іх колькасць па губернях істотна не адрознівалася, за выключэннем Віленскай губерні, дзе духавенства, якое атрымала вышэйшую адукацыю, было ў два разы

больш, чым у іншых губернях. Узровень адукацыі духавенства змяняўся ад стану святара ў царкоўнай іерархіі, і наадварот.

Патрэбна сказаць, што па ўсіх губернях большасць свяшчэннаслужыцеляў выконвала службу ва ўзросце ад 20 да 39 гадоў — 41,2 %. Найбольшая іх колькасць была сярод святароў Магілёўскай губерні і складала 27,5 % [12], найменшая ў Віцебскай губерні — 15 % [13].

---

[1] Первая Всеобщая перепись Российской империи 1897 г. Вып. IV. Виленская губерния. Тетр. 3. Спб., 1903. Табл. XII. С. 54—55; Вып. V. Витебская губерния. Тетр. 3. Спб., 1903. Табл. XII. С. 74—75; Вып. XI. Гродненская губерния. Спб., 1903. Табл. XII. С. 100—101; Вып. XXII. Минская губерния. Спб., 1904. Табл. XII. С. 78—79; Вып. XXIII. Могилевская губерния. Спб., 1903.Табл. XII. С. 94—95.

[2] Тамсама. Вып. IV. Табл. XXI. С.106; Вып. V. Табл. XXI. С.164; Вып. XII. Табл. XXI. С. 194; Вып. XXII. Табл. XXI. С. 152; Вып. XXIII. Табл. XXI. С.172.

[3] Тамсама. Вып. IV. Табл. XXIV. С.162; Вып. V. Табл. XXIV. С. 254; Вып. XII. Табл. XXIV. С. 288; Вып. XXII. Табл. XXIV. С. 222; Вып. XXIII. Табл. XXIV. С. 250.

[4] Тамсама. Вып. XXII. Табл. XXII. С. 158.

[5] Тамсама. Вып. IV. Табл. XXII. С. 110.

[6] Тамсама. Вып. XXIII. Табл. XXII. С. 178.

[7] Тамсама. Вып. XII. Табл. XXII. С. 202.

[8] Тамсама. Вып. IV. Табл. XXII. С. 110.

[9] Тамсама.

[10] Тамсама. Вып. XXII. Табл. IX. С. 52—53.

[11] Тамсама. Вып. IV. Табл. IX. С. 28—29.

[12] Тамсама. Вып. XXIII. Табл. XX. С. 170—171.

[13] Тамсама. Вып. V. Табл. XX. С. 162—163.